Прэзентацыя

Вольга НОРЫНА,
фота Сяргея Анцуха

# Чалавек, які вярнуў танец

У выдавецтве "Чатыры чвэрці" ўбачыла свет кніга "Хто, калі не я", прысвечаная 60-годдзю Міколы Козенкі. Вядомы дзеяч беларускай культуры, этнограф, даследчык харэаграфічнай спадчыны беларусаў, аўтар шматлікіх публікацый па праблемах аўтэнтычнага фальклору і аматарскай харэаграфічнай творчасці, мастацкі кіраўнік і рэжысёр фестываляў "Беларуская полька" і "Берагіня" — вось няпоўны пералік таго, што можна сказаць пра чалавека, які распачаў на Беларусі "харэаграфічную рэвалюцыю".

Намаганнямі Міколы Аляксеевіча і яго паплечнікаў зроблена ўсё, каб не перарваўся ланцужок перадачы каранёвай харэаграфічнай культуры беларусаў ад старэйшага пакалення наступным. Дзякуючы яму ў рэпертуары многіх сучасных аматарскіх танцавальных калектываў каронымі нумарамі сталі побытавыя танцы, мясцовыя асаблівасці якіх вывучаны дасканальна. Пра чалавека, які столькі зрабіў для захавання нематэрыяльнай спадчыны, на старонках гэтага выдання расказваюць прафесар культуралогіі Аляксей Рагуля, старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, сябры, вучні, аднадумцы. У кнігу ўвайшлі выбраныя артыкулы М. Козенкі, прысвечаныя танцавальнаму фальклору беларусаў, пералік яго публікацый, навукова-даследчых і практычных прац, радавод. Выданне багата ілюстравана фотаздымкамі з сямейнага архіва. Знойдуцца сярод ілюстрацый і ноты народных песень, і схемы старажытных танцаў. Думаецца, кніга пойдзе на карысць усім, хто цікавіцца народным мастацтвам і гісторыяй.

Укладальнік навукова-папулярнага выдання, выдадзенага пры падтрымцы Мінскага гарадскога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вячаслаў Калацэй адзначыў: "Кніга падрабязна адлюстроўвае жыццёвы і творчы шлях гэтага чалавека. Яго асоба заўсёды прывабная і прыцягальная для многіх людзей, таму што ён чалавек справы. Тое, пра што іншыя толькі мараць ды праектуюць, ён паспяхова здзяйсняе. Дзякуючы яму побытавы танец Беларусі зноў вярнуўся ў наша жыццё. Ім цікавяцца і дарослыя, і моладзь".

Сам юбіляр упэўнены: "Трэба выдаваць падрабязныя біяграфіі не толькі артыстаў балета і акцёраў кіно. Кожнаму, хто ўсё жыццё працуе на ніве культуры, трэба казаць "дзякуй" пры жыцці".




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ